# ПЕРШАЯ РАСІЙСКАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ Ў СУЧАСНАЙ УКРАІНСКАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ

# THE FIRST RUSSIAN REVOLUTION IN MODERN UKRAINIAN HISTORIOGRAPHY

**В. А. Кахновіч,**
кандыдат гістарычных навук, дацент.
Беларускі дзяржаўны універсітэт (БДУ),
кафедра гісторыі Расіі

**V. A. Kahnovich,**
candidate of historical Sciences, associate Professor.
Belarusian state University (BSU), Minsk,
the Department of history of Russia

**Ключавыя словы:** украінская гістарыяграфія, рэвалюцыя 1905 — 1907 гг., сялянскі рух, рабочы рух, палітычныя партыі, Просвіта.
**Key Words:** Ukrainian historiography, the Revolution of 1905—1907, peasant movement, labor movement, political parties, Prosvita.

**Рэзюме:** Дадзены агляд шэрагу сучасных прац украінскіх даследчыкаў па проблемам, што закранаюць Першую расійскую рэвалюцыю 1905—1907 гг. Акрэслена пераемнась украінскай гістарыяграфі поздняга савецкага і навейшага перыядаў. Таксама адзначана тэматычная скіраванасць сучасных працаў: 1) сялянскі рух, 2) грамадская ініцыятыва «Просвіта», 3) дзейнасць партый Украіны, 4) рабочы рух.
**Summary:** A review of a number of contemporary works of actually Ukrainian researchers about the First Russian Revolution of 1905—1907. There was a continuity of achievements of Ukrainian historiography of the late Soviet and modern period. Also marked thematic focus of contemporary works: 1) the peasant movement, 2) public initiative "Prosvita" 3) the activities of parties in Ukraine, 4) the labor movement.

Сучасная украінская гістарыяграфія агульна больш увагі прыдзяляе рэвалюцыйным падзеям 1917—1920 гг., а падзеі рэвалюцыі 1905—1907 гг. застаюцца ў цяні пазнейшых падзей [1]. Заўважна таксама і тая тэндэнцыя, што моцны ўплыў на украінскую гістарыяграфію робяць

працы Андрэа Грацыёзі і Тэадора Шаніна, дзе ў аснове аграрная ці сялянская рэвалюцыя як заканамерны вынік працэсаў мадэрнізацыі.

Што ж датычыць падзей першай расійскай рэвалюцыі 1905—1907 гг., то выяўляецца вялікае значэнне такіх класікаў украінскай савецкай гістарычнай навукі, як Фёдар Яўхімавіч Лось, чыя праца «Революція 1905—1907 рр. на Украïне», што ўпершыню была выдадзена ў 1955 г. і затым некалькі разоў у пашыраным і дапарацаваным выглядзе перавыдавалася, а таксама Мікалай Нікіфаравіч Ляшчэнка (яго праца «Українське село в революції 1905—1907 рр.», Київ, 1977 г.) [2; 3, с. 147—204]. Таксама з’явіўся шэраг прац украінскіх даследчыкаў, што закранаюць падзеі рэвалюцыі 1905—1907 гг. ва Украіне пры разглядзе тых альбо іншых аспектаў нацыянальнай украінскай гісторыі.

Так, найперш гэта тыя дысертацыі, дзе прадстаўлены сялянскі рух у пачатку ХХ ст.: Дмітры Васільевіч Кудзінаў (Кіеў, 2009), Алена Ўладзіміраўна Герасіменка (Чаркасы, 2008), у тым ліку у кантэксце вывучэння аграрных пераўтварэнняў — Аляксандр Уладзіміравіч Міхайлюк (Днепрапятроўск, 2009), Васіль Уладзіміравіч Сажко (Чарнаўцы, 2001), Юры Міхайлавіч Прысяжнюк (Данецк, 1997). Разгледжаны падзеі рэвалюцыі 1905—1907 гг. у працах аб рабочым руху і страйкавай барацьбе (Святлана Сяргееўна Ткачэнка, Харкаў, 1997), дзейнасці палітычных партый Украіны: украінскіх эсэраў (Таццяна Анатольеўна Беўз, Кіеў, 2005; Наталля Аляксандраўна Сіталава, Днепрапятроўск, 2009), украінскіх сацыял-дэмакратаў (Аляксандр Аляксеевіч Чэпурка, Днепрапятроўск, 2009; Аляксандр Юр’евіч Высоцкі, Кіеў, 2000; Анатоль Іванавіч Паўко, Данецк, 2001). Вялікі інтарэс таксама ўяўляюць працы аб руху «Просвіта» (А. В. Лысенка, 1998; В. У. Малюта, 2005; У. М. Зялёны, 2005; Г. Г. Кучараў, 2007; А. Б. Грэчка, 2007; Л. І. Бадзеева, 2004 і інш.), аб вясковай каапераціі на пачатку ХХ ст. (А. В. Двайнінава, 2004), а барацьбе рэпрэсіўных органаў улад з рэвалюцыйным рухам (Аляксандр Пятровіч Сарнацкі, Днепрапятроўск, 2008; Любоў Васільеўна Страмілюк, 2007).

Абагульняючы, трэба сказаць аб тым, што захоўваецца пільны даследчыцкі інтарэс да сялянскага пытання і руху. Заўважана, што вялікі крок наперад у гэтым рэчышчы зрабіла А. У. Герасіменка. Яна дэталёва разабрала метадалогію даследавання сялянскага руху, аргументавана адзначыла вялікі ўнёсак савецкай украінскай гістарыяграфіі ў вывучэнне дадзенага пытання і налічыла ў перыяд рэвалюцыі 1905—1907 гг. 1732 сялянскіх выступленняў на Левабярэжнай Украіне [4, с. 12, 21]. У той жа час паводле М. Н. Ляшчэнка такіх выступаў налічвалася 1082, што і было прынята ў украінскай гістарыяграфіі раней [3, с. 177]. Звернем увагу на тое, што А. У. Герасіменка ажыццявіла сваі падлікі на аснове шырокай архіўнай базы крыніц, і высновы яе павяртаюць Левабярэжнай Украіне тое законнае месца «перадавіка» сялянскага руха, як тое ў свой

час адзначалі і сучаснікі падзей. Так, на працягу 1907—1914 гг. адзначана было 358 сялянскіх выступаў на тым жа Левабярэжжы. З іх болей за палову ў Харкаўскай губерні, дзе найбольш інтэнсіўна праходзілі мерапрыемствы сталыпінскай аграрнай рэформы. А. У Герасіменка было ўстаноўлена, што рэформа выклікала масавае незадаволенне сялян, бо не вырашала сацыяльныя праблемы вёскі [4, с. 24].

Напэўна, удалае і ацэначнае абагульненне падзей рэвалюцыі 1905—1907 гг. у сучаснай украінскай гістарыяграфіі знаходзім у В. В. Сажко і А. П. Сарнацкага. Так, В. В. Сажко адзначае: малазямельная збольшага украінскае сяло мела лішак рабочай сілы ў 9177 тыс. чалавек, тады як прамысловасць краіны патрабавала ўсяго 1080 тыс. чалавек; адначасна зрусіфікаваны ў вялікай меры горад у Наддняпроўскай Украіне зняважліва ставіўся да патрэб, працы, побыту, мовы і маральных каштоўнасцей украінскай вёскі [5, с. 8]. Апошняе прывяло да того, што падчас рэвалюцыі 1905—1907 гг. сялянскі рух заставаўся збольшага стыхійным, але насуперак таму сяляне сфарміравалі свае асноўныя патрабаванні: справядлівы перадзел зямлю тымі, хто яе абрабляе; канфіскацыя зямель без выкупу; выбарныя органы і суд прысяжных; раўнапраўнасць усіх перад законам; даступная асвета на ўкраінскай мове; аўтаномія Украіны; выбарнае духавенства; прагрэсіўнае падаткаабкладанне [5, с. 9]. Д. В. Кудзінаў на прыкладзе Левабярэжжа ўдакладніў: значны ўплыў і падтрымку сярод украінскіх сялян мелі УСДРП і Спілка, таму нават пасля ваеннага тэрору ўлад супроць сялян і злому тымі сялянскага руху, у 1906 г. вёску ахапілі страйкі [6, с. 9—10].

А. П. Сарнацкі на шырокай крынічнай базе адзначыў, што расійскія імперскія ўлады асабліва жорстка падаўлялі на тэрыторыі Украіны як рэвалюцыйны, так і агульна нацыянальны рух [7, с. 16—17]. Так, В. Сухамлінаў, кіеўскі генерал-губернатар, дамогся больш жорсткага перагляду 171 следчай справы за 1905—1907 гг. ваеннымі судамі, у 1906—1907 гг. і затым у 1910—1914 гг. на украінцаў абрушыліся магутныя хвалі рэпрэсій: у 1906 г. разгромлена УСДРП, у пачатку 1907 г. — Спілка, у 1910 г. арыштавана маса нацыянальна-культурніцкіх дзеячаў, рэшта якіх кінута за краты ў 1914 г. [7, с. 16, 19. 21, 25].

Такая сітуацыя, па меркаванню А.П. Сарнацкага, І. Ф. Кураса і цэлага шэрагу ўкраінскіх даследчыкаў няўхільна вяла да абвастрэння рэвалюцыйнага крызісу і панавання сацыялістычных ідэй [7, с. 25; 3, с. 209]. Падсумоўваючы, можна зрабіць высновы аб захаванні ва ўкраінскіх даследчыкаў вялікай зацікаўленнасці ў вывучэнні сялянскай тэматыкі. Адзначым і новае: паглыбленне ў даследаванне дзейнасці і ідэалагічных асноваў палітычных партый Украіны, «Просвіты», а таксама рэакцыі грамадскасці на выклікі часу. Пры тым, што назіраецца

пэўная пераемнасць з найбольш каштоўнымі дасягненнямі і гэта адкрывае новы погляд на гістарычныя падзеі пачатку XX ст.

***Літаратура***

1. Демократична революція 1905—1907 рр. в Україні: актуальни проблеми вивчення: мат-лі наук. конф., 24 лютого 2005 р., Дніпропетровськ / Дніпропетровський націон. ун-т; відп. ред. С. І. Світленко. Дніпропетровськ, 2005. 182 с.

2. *Милько В. І.* Участь дупутатів віл українських губерній та міст у роботі 1—4 державних дум Россійської імперії (1906—1917 рр.): історіографічний аналіз. // Українські історичній журнал. 2012. № 1. С. 155—170.

3. Політична історія Ураїни. XX століття: у 6 т. / Ю. А. Левенець, Л. П. Нагорна, М. С. Кармазіна; ред. рада: І. Ф. Курас [і інш.]. Київ : Генеза, 2002. Т. 1: На заламі століть (кінець XIX ст. — 1917 р.). 420 с.

4. *Герасименко О. В.* Селянський рух на Лівобережній Україні (1900 — лютий 1917 рр.). / Черкаські націон. ун-т імені Богдана Хмельницького. Черкаси, 2008. 32 с.

5. *Сажко В. В.* Проблеми аграрних перетворень в Україні у 1900—1913 роках: історико-політичний аспект. /Чернівецький націон. ун-т імені Юрія Федьковича. Чернівці, 2005. 17 с.

6. *Кудінов Д. В.* Селянський рух у Лівобережній Україні в 1905—1907 рр. / Київські націон. ун-т імені Тараса Шевченка. Київ, 2009. 14 с.

7. *Сарнацький О. П.* Російський самодержавний апарат та українські політичні партії (1900—1917 рр.). / Дніпропетровський націон. ун-т. Дніпропетровськ, 2008. 32 с.